# «ПОЗНАЙ БЕЛАРУСЬ»

## ГУО «СРЕДНЯЯ ШКОЛА №2 Г. СМОЛЕВИЧИ»



**Руцкая Полина**

# Якуб Колас

*Жыццё і творчасць*

***О, як бы я хацеў спачатку***
***Дарогу жыцця па парадку***
***Прайсці яшчэ раз, азірнуцца…***
***К вясне б маёй хацеў вярнуцца.***

**Сапраўднае імя Кастанцін Міхайлавіч Міцкевіч**
**Нарадзіўся 3 лістапада 1882 года ў вёске Акінчыцы, у сям'і лясніка.**





**Бацька мой быў невялкай адукацыі: умеў распісацца, чытаць па-польску і па-руску. Разбіраў нават і рукапіс. Маці мая, Ганна Юр'еўна з Лёсікаў, зусім няграматная, але разумная ад прыроды і добрая жанчына…**

**Я. Колас, "Аўтабіяграфія"**



Ласток.Хата, у якой з 1885 па 1890 год жыла сям'я Міцкевічаў.

**Самыя раннія дзіцячыя гады мае прайшлі ў Сухошчыне, або Ластку. Гэта глухое месца – поле, навокал лес і адна толькі сядзіба лесніка: хата, гумно, хлеў.**

**Я. Колас, "Аўтабіяграфія"**

***Мне было гадоў 9, як пераабраліся мы з Ластка на новае месца ў Альбуць. Тут прайшлі лепшыя гады майго дзяцінства і майго жыцця.***

**Я. Колас, “Аўтабіяграфія”**



***Альбуць. Хата, у якой з 1891 па 1902 год жыла сям’я Міцкевічаў.***

# “Я любіў навуку, кнігі…”

**Рэжым быў суровы, манастырскі… Але семінарыя мела тое добрае значэнне ,што прывучыла да праца, дысцыпліны, парадку.**

**<u>Я. Колас, “Аўтабіяграфія”</u>**



**Будынак Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, дзе з 1898 па 1902 год вучыўся Я.Колас**

**“Выхаванне семінарскае грунтавалася на законе божым, на прынцыпах ультраманархічных і патрыятычных.”**






**“Але таварыскае асяроддзе і юначы ўзрост, калі асабліва абуджаецца дух крытыкі і скептытцызму, рабілі сваё, і к канцу знаходжання ў семінарыі мы станавіліся вальнадумцамі ў адносінах да бога і рэлігіі. “**



№ 1.

Год I

Вильня, 1 сентября 1906 г.

Цена асобнаго нумару 5 кап. (10 грошей)

# Наша Доля

першая беларуская газэта для вёсковаго и местоваго робочаго народу

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литерами

## Наш родны край!

Край наш бедны, край наш родны!
Грась, балота ды пясок,
Чуць дзе троху луг пригодны...
Хвойник, мох ды верасок.
А туманы, як пяленка,
Засцилаюць лес и гай...
Ой ты, бедная старонка!
Ой, забыты Богам край!
Наше поле кепска родзиць.
Бедна тут жыве народ.
У грази ен, бедны, ходзиць,
А працуе — льецца пот.
Пазираюць нудна вески.
Глянешь — сэрца забалиць.



№ 2.

Год I.

Вильня, 15 сентября 1906 г.

Цена асобнаго нумару 5 кап. (10 грошей).

# Наша Доля

першая беларуская газэта для вёсковаго и местоваго рабочаго народу.

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литерами.

## Слабода.

Дзядзька Карусь.

"Пасля рэвалюцыі *1905* г. пачала выдавацца першая газета на беларускай мове "Наша доля". У нумары *1* за *1906* год надрукаваны першы верш "Наш родны край" – першы мой апублікаваны твор. Праз паўмесяца (*15* верасня) у нумары *2* той жа газеты змешчана першае маё апавяданне "Слабода" пад псеўданімам Дзядзька Карусь."

“Вясною 1907 г. я паехаў у Вільню на работу ў рэдакцыю газеты “Наша Ніва”, але працаваў там нядоўга. Паліцыя забараніла жыць у Вільні, і я прымушаны быў выехаць з горада.”




**Вільнюс. Будынак, дзе знаходзілася рэдакцыя газеты “Наша Ніва”**



***“Мая першая непасрэдная сустрэча з Янкам Купалам адбылася толькі летам 1912 г., амаль праз год пасля майго вызвалення з астрога.”***

...У 1912 г. я пазнаёміўся з маладою настаўніцай Пінскай чыгуначнай школы. Прозвішча яе было Каменская. Так у маё жыццё ўвайшла Марыя Дзмітраўна. Добра было б зірнуць на ўсё, што я пісаў ёй і пра яе. Я саромеўся тых вершаў. Завёў нават на іх запісную кніжку і на відавоку не пакідаў, насіў яе ў пільчаку. У друк, вядома, нічога не падаваў, няёмка адбіраць месца ў газеце і час у людзей на сваё, што толькі мне належала.. Адным словам, нават Марусі трапілі на вока мае вершы значна пазней, калі мы ўжо жылі разам.

М. Лужанін, *«Колас расказвае пра сябе»*.



**Марыя Дзмітраўна Міцкевіч, жонка паэта**




Якуб Колас
Новая зямля
Поэма




Якуб Колас
Сымон
Музыка
Поэма
Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі
Менск 1925


Першыя крокі
На рубяжы
Крок за крокам
Мэтодыка роднае мовы
Выбраныя творы



*У 1928 (1929) годзе быў абраны віцэ-прэзідэнтам Беларускай Акадэміі навук...*



К.Крапіва, П.Броўка, Я.Колас, А.Куляшоў і М.Танк на Краснай плошчы, 1948.



Не стала паэта 13 жніўня 1956, ён пахаваны ў Мінску, на Вайсковых могілках, побач з Я.Купалам.




**Помнік на магіле Я.Коласа**

Цвітуць палі ў кроплях буйных рос,
Шумяць бары, а сэрца плача ўголас,
Мой родны кут, упаў буйнейшы колас,
Што на тваёй зямлі ўзрос.
Ён не паспеў аб нашым слаўным часе
Ўсяго сказаць, усіх паэм злажыць,
Пайшоў пясняр, а песня засталася,
Памёр паэт, а песня будзе жыць!

**С.Грахоўскі “Песня будзе жыць”**